❄ З НОВЫМ 1999 ГОДАМ! ❄




# Гродзенскі УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года • № 10 (261) • 31 снежня 1998 года, чацвер
Выходзіць адзін раз на месяц • Распаўсюджваецца бясплатна


## НАВАГОДНЯЕ

*Людміла ДАНІЛАВА*

Пакрыты белым снегам
нівы,
Зіхцяць сняжынкі, нібы
свечкі.
Каб стаў увесь год для
нас шчаслівым,
Забудзем крыўды,
плёткі, спрэчкі.
Так урачыста ўсё і
гожа!
Хай стол заўжды
багатым будзе,
Хай будзе на душы
прыгожа,
Хай доля ўсміхнецца
людзям.
На белым, як сняжок,
абрусе
Блішчаць крыштальныя
кілімы.
За шчасце роднай
Беларусі
Хай кожны свой бакал
падыме.
Народзе, працавіты,
шчыры,
У святое не згубіўшы
веры,
Дабра табе, святла і
міру!
Адкрый свае для
шчасця дзверы!




*Мал. студэнткі 4 курса аддзялення мастацтваў С.ЦІХАМІРАВАЙ.*

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць з юбілеем.

1 студзеня - **Уладзіміра Яўгенавіча ЯГОРЫЧАВА** - дацэнта кафедры гісторыі Беларусі.

2 студзеня - **Уладзіміра Іванавіча КАЯЛУ** - старшага выкладчыка кафедры беларускай мовы.

2 студзеня - **Тамару Іванаўну КАЗАК** - метадыста навучальнага аддзела па завочным навучанні.

6 студзеня - **Марыю Леанардаўну ЕШЧАНКА** - дзяжурную інтэрната N 4.

10 студзеня - **Галіну Піліпаўну АНДРЭЙЧЫК** - дацэнта кафедры эканомікі і арганізацыі камерцыйнай дзейнасці.

17 студзеня - **Вольгу Георгіеўну ІВАНЮГА** - лабаранта кафедры спецыяльных музыкальных інструментаў.

18 студзеня - **Людмілу Эдуардаўну ЦІПЛАШЭВІЧ** - намесніка начальніка аддзела кадраў.

20 студзеня - **Ларысу Мікалаеўну БАРАНАВУ** - старшага выкладчыка кафедры замежных моў.

23 студзеня - **Галіну Іванаўну РАДЗЕЦКУЮ** - вартаўніка навучальнага корпуса N 6.

27 студзеня - **Ларысу Алегаўну ЛІШЧУК** - бібліятэкара І катэгорыі.

28 студзеня - **Марыю Барысаўну ЧАРНОВУ** - дацэнта кафедры псіхалогіі пачатковай школы.

## ШЧАСЦЯ І ПОСПЕХАЎ ВАМ!

Адыходзіць у мінулае яшчэ адзін год календара. Для калектыву універсітэта ён быў юбілейным: мы адзначалі 20-годдзе пераўтварэння пед-інстытута ва універсітэт. Падводзілі вынікі работы за ўвесь гэты час. І аказалася, што да свайго юбілею прыйшлі з даволі значнымі набыткамі. Не будзем сёння стамляць вас лічбамі. Дастаткова сказаць, што універсітэт - рэгіянальны цэнтр адукацыі, навукі і культуры. Дасягнуты высокі ўзровень выкладання. Укараненне інфармацыйных тэхналогій у адукацыйнай сферы дапамагае студэнтам атрымліваць вышэйшую паглыбленую адукацыю.

У калектыва універсітэта шмат набыткаў, а яшчэ больш - творчых задумак і планаў. Для іх ажыццяўлення патрэбны фінансы, час, здароўе, імкненне. Жадаем жа ўсім Вам, паважаныя калегі, і кожнаму асабіста шчасця, здароўя, поспехаў, творчага гарэння. Няхай заўсёды гарыць агеньчык пошуку, няхай у паўсядзённых справах і праблемах знаходзіцца месца для свята, для радасці і кахання. Плёну Вам!

**РЭКТАРАТ, ПРАФКАМ, САВЕТ ВЕТЭРАНАЎ.**

Надыходзіць Новы, 1999 год. Якім ён будзе для студэнцтва? Вядома ж, кожны з нас спадзяецца, што стане ён крышку лепшым, больш шчаслівым і шчодрым на выдатныя адзнакі, на стыпендыю, проста на дабрыню. Што ж, няхай застаецца ў Вашых сэрцах чаканне цуда, імкненне да шчасця, да ведаў, да ўсяго новага.

Віншуем усіх студэнтаў з Новым годам. Жадаем шчасця, здароўя, выдатнай вучобы, поспехаў, пошукаў, знаходак, усяго таго, што бывае толькі ў маладосці.

З Новым годам!

**ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ.**

## ЦИТАТА НОМЕРА:

**«Подлинным зеркалом нашего образа мыслей является наша жизнь».**
**М.Монтень.**

# ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ - 60 ГАДОЎ

*Афіцыйна*

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На адным са снежаньскіх пасяджэнняў рэктарата слухалася пытанне «Аб стане спраў і развіцці філалагічнага факультэта». З інфармацыяй выступілі намеснікі дэкана Л.М. Серада, Д.М. Лебядзевіч, Т.М. Прудко, В.К. Царлюкевіч. Кожны расказаў аб справах на сваім аддзяленні, аб рабоце па выхаванні студэнтаў і падрыхтоўцы спецыялістаў.

Сёння філалагічны факультэт - адзін з найбольш шматлікіх ва універсітэце. Толькі на аддзяленні замежных моў на чатырох кафедрах працуюць 86 выкладчыкаў. З іх дзесяць - дацэнты, 7 вучацца ў аспірантуры. Да работы прыцягваецца шмат замежных спецыялістаў. Плануецца набор у магістратуру. На аддзяленні вядзецца метадычная работа, на кафедры замежных моў выдадзена дзевяць метадычных дапаможнікаў. Аддзяленне можа развівацца і далей. Плануецца стварэнне дзвюх новых кафедр на аддзяленні рамана-германскай філалогіі, стварэнне лабараторый вуснай мовы. Аднак недахоп памяшканняў адбіваецца не лепшым чынам на рабоце...

На пасяджэнне рэктарата быў прадстаўлены праект плана перспектыўнага развіцця філалагічнага факультэта на бліжэйшыя два гады.

У гэтым плане - і стварэнне новых кафедр і лабараторый, і адкрыццё новых спецыялізацый, магістратуры і аспірантуры. Знойдзе сваё месца правядзенне канферэнцый, выхаваўчая і ідэйна-выхаваўчая работа са студэнтамі.

*ПОСТАЦІ ВНУ*

## І СНІЛАСЯ ХЛОПЧЫКУ ЖЫТНЁВАЕ ПОЛЕ...

Віктар ТАРАНЦЕЙ,
прафесар

Наўрад ці была ў гісторыі нашай вну больш папулярная асоба, чым Сяргей Габрусевіч (нар.9.09.1936 г.). Шырокая, размашыстая душа, усмешка на ўвесь твар, добразычлівасць, прыязнасць, жаданне дапамагчы нават незнаёмаму чалавеку, прафесіяналізм, выдатныя арганізатарскія здольнасці - вось толькі некаторыя адметныя рысы характару С.А. Габрусевіча. Усё гэта спалучалася з непаказной любоўю да сваёй Беларусі, яе народа, з нянавісцю да ворагаў Радзімы.

... Будучы хлапчуком пяцігадовага ўзросту, Сяргей на ўсё жыццё запомніў такі малюнак. На ўскрайку яго роднай вёсачкі Верхаўляны па жытнёвым полі адступалі ўзброеныя вінтоўкамі чырвонаармейцы. Разам з імі рухаўся танк. Раз-пораз пралятаўшыя нямецкія штурмавікі пасыпалі бомбамі гэтае поле. І ўсё ж такі запалілі савецкі танк. Чырвонаармейцы стралялі па самалётах з вінтовак. Глядзячы на жудасную карціну няроўнай бітвы, хлопчык да болю сціскаў кулачкі і марыў аб тым, каб адпомсціць фашысцкім акупантам. Нянавісць да фашыстаў і актыўныя дзеянні разам з аднавяскоўцамі праявілі і бацька, былы настаўнік, і маці-калгасніца. У 1942 годзе маленькая родная вёсачка была спалена немцамі за сувязь яе жыхароў з партызанамі, а бацька расстраляны. І з тых часоў заўсёды снілася хлапчуку тое беларускае жытнёвае поле каля Бераставіцы ў розных яго адценнях...

Пасля заканчэння сярэдняй школы С.А. Габрусевіч прайшоў важкую працоўную закалку. Працаваў загадчыкам яшчэ захаваўшайся ў пачатку шасцідзесятых гадоў хаты-чытальні, служыў у арміі («па волі бога і нябес папаў служыць я ў ВПС - ваенна-паветраныя сілы»), тры гады працаваў у калгасе («да сённяшняга часу помню пах скошанага лугу»). У 1960 годзе С.А. Габрусевіч паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт нашай вну.

Працоўная біяграфія ў педінстытуце, а затым ва універсітэце, пачалася ўжо ў перыяд вучобы. Студэнты абралі Сяргея ў 1962 годзе сваім маладзевым важаком. У 1964-65 гг. ён спалучае вучобу з загадваннем навучальнай часткай (!) педінстытута. Па заканчэнні вучобы таленавітага юнака накіроўваюць на выкладчыцкую працу на кафедру філасофіі і палітэканоміі. Ён праходзіць усе ступені выкладчыцкай лесвіцы, працуе асістэнтам, выкладчыкам, дацэнтам, прарэктарам па навуковай працы, загадчыкам кафедры, прарэктарам па вучэбнай рабоце, прафесарам.

Прарэктара Габрусевіча любілі за адданасць справе, за адкрытасць у зносінах. У яго службовы кабінет можна было ўвайсці запраста выкладчыку, аспіранту, студэнту. Там наведвальнік атрымліваў зарад чалавечнасці і аптымізму. Менавіта ён з'явіўся ініцыятарам рэзкага паднясця ролі і месца студэнцкай навукі ў падрыхтоўцы спецыялістаў. Упершыню ва універсітэце даведаліся, што сабой уяўляюць гаспадарча-разліковыя даследаванні. У гэты час ішло станаўленне навукова-даследчага сектара. Пры Габрусевічы была закладзена кадравая аснова сённяшняга універсітэта.

Калектыў цаніў заслугі прарэктара. Калі С.А. Габрусевіч сумняваўся ў сваім электараце, то ён смела праводзіў галасаванне наконт даверу да сябе на пасяджэнні Савета вну.

З 1992 года С.А. Габрусевіч, ужо прафесар, актыўна прысвяціў сябе служэнню беларускай культуры, распрацаваў і чытае арыгінальныя лекцыі па курсах «Гісторыя і культура Беларусі», «Грамадская і філасофская думка Беларусі». Шмат робіць С.А. Габрусевіч для папулярызацыі і развіцця духоўнай спадчыны Гродзеншчыны, ушанавання лепшых людзей беларускай, рускай і польскай культуры. Як старшыня Гродзенскага аддзялення Беларускага фонду культуры, ён аказвае падтрымку ў выпуску кніг, брашур, правядзенні гуманітарных акцый. Прафесар С.А. Габрусевіч - заснавальнік часопіса «Сьвіцязь». Ён вылучаецца тым, што цвёрда стаіць на нацыянальных пазіцыях, мае асабісты погляд на далейшае развіццё беларускай культуры.

Доўга не звязваючы сябе сямейнымі абавязкамі, С.А. Габрусевіч аказаўся выдатным сем'янінам. Зараз ён разам з жонкай-урачом Раісай Лявонцьеўнай выхоўвае цудоўных дачку і сына.

Найлепшай узнагародай за сваю працу С.А. Габрусевіч лічыць павагу і высокую ацэнку супрацоўнікаў і студэнтаў.

# Студенческий меридиан

Аляксандр Флёрка родам з Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Бацькоўскі дом, родная школа, мама - усё далёка. Але юнак не пашкадаваў аб сваім выбары. Бо ва універсітэце ён знайшоў усё: і сяброў, і падтрымку. Паступіў ён на факультэт фізкультуры. Спачатку захапіўся валейболам. А потым стаў займацца лёгкай атлетыкай. З кожнай сесіяй у Аляксандра ўсё лепшая паспяховасць. Апошнюю летнюю сесію здаў на «выдатна».

**На здымку: студэнт 5 курса факультэта фізічнай культуры Аляксандр ФЛЁРКА.**





Як важна мець у жыцці захапленне! Яўген Дарагуш яшчэ ў школе захапіўся камп'ютарам. А сёння ён разбіраецца ў INTERNET-тэхналогіях, рыхтуе старонкі з INTERNETа для свайго факультэта, працуе ў маладзёжным камп'ютарным цэнтры.

Яўген сам прызнаўся, што ён не выдатнік па асобных дысцыплінах. Але што датычыць праграміравання - тут ён як рыба ў вадзе. Варта дадаць, што Яўген Дарагуш - шчыры, адкрыты юнак, якога паважаюць.

**На здымку: студэнт 4 курса матэматычнага факультэта Яўген ДАРАГУШ.**

## ГЭТА - МЫ!

*Першакурснікі факультэта гісторыі і культуры віншуюць з Новым годам калектыў выкладчыкаў і работнікаў дэканата Т.Б. Блінову, С.В. Марозаву, В.Э. Працэнка, І.А. Фёдарава, Л.П. Сакалову, І.І. Коўкеля, В.М. Чарапіцу, С.У. Данскіх, С.І. Семянюк, Т.Т. Кручкоўскага і інш. А асабліва - дэкана факультэта Івана Платонавіча Крэня, які ў гэтым навучальным годзе прыклаў неверагодныя намаганні, каб пазбавіць рознабаковых праблем многіх навучэнцаў факультэта.*

*Мы, студэнты, жадаем, каб удача дарыла Вам свае ўсмешкі, а пра здароўе ніколі не прыходзілася б турбавацца, каб кожны новы дзень у Новым годзе прыносіў Вам адкрыцці, якія б радавалі Вас, Вашых калег і, зразумела, нас. Няхай цёмныя хмары ніколі не азмрочваюць небасхіл і шматлікія праблемы абыходзяць Вас.*

*Дзякуй Вам за працу, клопат і цярпенне.*

***Вашыя студэнты.***



**Фота Уладзіміра ЖЫЛКО і Дзмітрыя СІДОРЫКА.**

## СУСТРЭЧА З ПАСЛОМ

Напрыканцы года адбылася адметная падзея ў жыцці калектыву выкладчыкаў і студэнтаў нашага універсітэта: да нас завітаў надзвычайны і паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у ЗША В.Ю.Цапкала. На сустрэчу з пасломпрыйшлі ўсе, хто пажадаў даведацца, як кажуць, з першых вуснаў пра ўзаемаадносіны дзвюх краін - Беларусі і ЗША, пра тое, як жывуць амерыканцы. Цікавіла многіх і асоба пасла Беларусі ў такой дзяржаве, як ЗША. Што гэта за чалавек, які ён?

В.Ю. Цапкала пачаў з таго, што пазнаёміўся з прысутнымі. Ён расказаў пра сябе - працаваў у Міністэрстве замежных спраў СССР, быў паслом у Фінляндыі, потым - саветнікам, намеснікам міністра ў міністэрстве Рэспублікі Беларусь.

Якімі ўбачыліся Злучаныя Штаты? Пасол расказаў аб поліэтнічнай цывілізацыі, якая склалася дзякуючы ідэі амерыканцаў, іх веры ў сваю выключнасць, у сваю свабоду, у тое, што ў гэтай краіне можна жыць лепш. Людзі, якія прыехалі «заваёўваць» Амерыку, мелі ў руках толькі Біблію і рыдлёўку. Прайшло шмат часу, перш чым яны адчулі сябе народам. А пачыналася ўсё з таго, што людзі атрымалі ў карыстанне па кавалку зямельнай плошчы.

Пасол расказаў прысутным і аб праблемах, якія хвалююць амерыканцаў і якія звязаны якраз з поліэтнічнасцю народа.

Асобным пунктам размовы сталі ўзаемаадносіны Рэспублікі Беларусь і ЗША. Адносіны, як зазначыў В. Цапкала, развіваліся няроўна. Ёсць пазітыўныя маменты, дзе нашы краіны працуюць даволі плённа. Гэта - гандаль і эканоміка. Плануюцца сумесныя прадпрыемствы. У штаце Тэхас, напрыклад, наладжваецца вытворчасць БелАЗаў. Маюць попыт у Злучаных Штатах нашы станкі, трактары.

В.Ю. Цапкала адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

*КЛУБ ИНТЕРЕСНЫХ ВСТРЕЧ*

# ДРУГОЙ ЖИЗНИ НЕ БУДЕТ...



Профессора Н.В. Павлович знает в Гродненском государственном университете имени Янки Купалы буквально каждый. И не только потому, что Наталья Васильевна - единственная женщина-декан, да еще такого серьезного факультета: биологии и экологии. Просто она интересный, эрудированный человек. С ней приятно общаться. И полезно: можно сделать много открытий. Еще кандидат медицинских наук Н.В. Павлович - обаятельная женщина, красивая той красотой, которая не блекнет с возрастом, потому что идет из глубин души.

**- Наталья Васильевна, вопрос, наверное, не нов: легко ли быть руководителем?**

- Конечно, нелегко. Приходится балансировать между интересами дела и желанием сохранить добрые отношения с коллегами, требовать добросовестного выполнения служебных обязанностей и всякий раз учитывать характеры людей, способности, личные проблемы, которых теперь у каждого - хоть отбавляй. Если атмосфера в коллективе не улучшает настроения, а добавляет стрессов, то жизнь становится невыносимой. В руководителе должны видеть человека, на чью помощь, дружеское внимание всегда можно рассчитывать.

И все же он не должен ориентироваться на всеобщую любовь и благодарность, на первом месте должна оставаться требовательность к себе и сотрудникам.

**- Вам, потомственному медику, наверное, легко было сделать выбор профессии. Но вы сделали и карьеру в медицине - ученая степень, звание, руководящая должность - все это свидетельствует о характере, о силе духа. Это так?**

- Пример родителей, ранняя вовлеченность в сферу их профессиональных забот облегчает выбор детей. Меня всегда привлекала наука о мозге, тайны его организации и работы, поэтому, еще будучи студенткой 2-го курса медицинского института, я начала работать в научном кружке кафедры физиологии человека и животных и уже не расставалась с этой наукой всю жизнь.

К руководящей должности не стремилась никогда, так уж судьба распорядилась. А сила духа и твердость характера - о них ведь судят по внешним проявлениям. Никто не измерял тех внутренних усилий, которые иногда за ними стоят.

**- Конечно же, деловая женщина не может не говорить о деле, о коллегах. Но давайте и о себе не забывать. Ваш имидж - как он создавался? Спортивный стиль одежды - это почти норма для деловой женщины. А остальное? Открытость, лаконичность, обаятельная улыбка - это результат работы над собой?**

- Открытость, улыбка, спортивный стиль - все это родом из детства. Спасибо родителям за счастливое детство, в котором не было места для зависти, злобы, а была возможность заниматься спортом, приводить домой друзей и подруг, которых тепло встречали, подкармливали, заинтересованно выслушивали.

И сейчас верю в то, что самозатраты на друзей - самое окупаемое и жизненно необходимое дело.

**- Известно, что кроме помощников-коллег у Вас есть еще один надежный друг - Ваш автомобиль. Он делает Вашу жизнь удобнее, улучшает ее качество, или, наоборот, добавляет проблем?**

- Не знаю, как другим, но мне за все радости жизни всегда приходилось платить. Поэтому друг-автомобиль облегчает жизнь, но его надежность целиком зависит от моих забот о нем.

Впору бывает задуматься: он для тебя или ты для него? Но надо уметь помнить хорошее. Справедливости ради следует признать, что положительных автоэмоций все же больше.

**- Первый учитель, первая любовь, первая работа... Такое обычно мы помним долго. А Ваш первый автомобиль?**

- Его, действительно, помню лучше, чем более поздние приобретения. Это был «Москвич-408», горячо любимый красавец голубого цвета. Просто не верится, что он был «одного помета» с теми обшарпанными, шумными развалинами, которые и сейчас еще тарахтят по дорогам, вызывая жалость, сочувствие и еще какое-то смутное чувство вины.

Все проблемы, которые были связаны с капризами «Москвича», теперь вспоминаются почти с умилением. А уж бензина по 40 коп. за литр было столько...

**- Кто был Вашим учителем вождения? Ведь наверняка в этом деле маловато тех уроков, что дает автошкола? Или, получив права, Вы дошли до тонкостей сами?**

- Терпеливым и мудрым учителем, благодаря которому обрела начальную увеенность в себе, был отец. Он передал, наверное, все, что мог, кроме выдержки, которую проявлял в роли инструктора. Когда позднее я уже сама выступила в этом амплуа, помогая мужу осваивать вождение, то, точно

могу сказать, что мы за всю жизнь столько не ругались, как в те дни.

**- Ремонт авто доставляет обычно хлопоты и вызывает головную боль...**

- Ремонт автомобиля уже давно воспринимаю как неизбежное зло, как беспардонных водителей или лениво-важных пешеходов - стараюсь не раздражаться. При моем 25-летнем водительском стаже лица автослесарей - как лица старых друзей.

Правда, цены на все это удовольствие неизменно повергают в шок...

**- Ваши отношения с ГАИ - они всегда были безоблачны?**

- На ГАИ обиды не держу. В молодые годы их снисходительное отношение к моим прегрешениям было почти правилом. В последнее время замечаю, что стражи ГАИ стали как-то суше и строже, хотя мы и реже перекрещиваемся (тьфу, тьфу, чтоб не сглазить). Мы, видимо, все больше расходимся в возрасте - я становлюсь все старше, а они - все моложе.

**- Биологу, наверное, сам Бог велел иметь в доме живность, растения...**

- Цветы в горшках и на клумбах люблю и культивирую с увлечением. Живность тоже не переводится. Сейчас у нас в доме - черная лайка, всеобщая любимица и защитница, постоянная забота но и радость, преданный друг.

**- Как складываются отношения декана со студентами? С кем легче общаться: с коллегами или с молодежью?**

- Уверена, что постоянное общение со студентами продлевает ощущение молодости и нам, преподавателям. Отношения со студентами, как мне кажется, у меня доверительные. Люблю я их, подлецов, хотя и ругаю иногда сильно, так сказать, в личной беседе. Верю, что из моих студентов должны получиться хорошие люди и грамотные специалисты, как правило.

**- Как семья относится к постоянной Вашей занятости? Находите ли время для источника женской радости - заботе о ближних?**



- Ближним забота о них всегда кажется недостаточной, сколько ни заботься. Мои уже привыкли, но руку на пульсе их потребностей я держу постоянно. Правда, когда всем сразу от тебя требуется внимание, просто теряешься.

**- Жизнь сейчас настолько напряженная, стремительная, что просто необходимо расслабляться. Откройте секрет: как? Как можно быть жизнерадостной, веселой, молодой при всех реалиях времени, проблемах?**

- Физиологу, да и вообще биологу, главной реалией жизни видится ее временность. Стоит ли рыдать по мелочам, расстраиваться по пустякам, когда при всех тяготах и проблемах остаются и все радости жизни: книги, дети, собаки, улыбки друзей, хорошие фильмы, любимая работа, природа. Другой жизни не будет, а проблемы были всегда.

**- Психологи считают, что маленькие двухдверные автомобили покупают в основном женщины властные, сильные, чтобы казаться... слабыми и беззащитными. Что Вы, хозяйка маленькой машины, думаете по этому поводу?**

- Большая машина, наверное, кроме всего прочего, придает уверенности, солидности и значимости человеку самоутверждающемуся. Я уже прошла этот этап и теперь предпочитаю мобильность, маневренность и экономичность.

**- Некоторые мужчины считают, что женщина в брюках, да еще за рулем, да еще деловая - это уже не совсем женщина. Можем ли мы им возразить - от Вашего имени - за всех нас?**

- Женщина даже при всех перечисленных недостатках все равно инстинктивно воспринимает мужчину как более сильного и защищенного и ждет от него великодушия, надежности. Поэтому женщины более ранимы, уязвимы, если встречаются с грубостью и беспардонностью. Представители сильного пола просто должны об этом помнить.

**- Что Вы могли бы пожелать нашим читателям в канун Нового года?**

- Оптимизма.

**Вопросы задавала Л. ДАНИЛОВА.**

## *Віншуем!*

**Галіну Піліпаўну АНДРЭЙЧЫК** з юбілеем. Жадаем моцнага здароўя, шчасця, даўгалецця.

**Савет ветэранаў.**

СПОРТ

# ШАХМАТЫ

В ноябре 1998 года прошло лично-командное первенство университета по шахматам среди студентов, в котором приняло участие 7 команд факультетов. Состав команды - 5 человек (4 юноши и девушка). Соревнования прошли по круговой системе с контролем времени по 20 минут на партию. Победительницей стала команда юридического факультета в составе: В. Цирлюкевич, В. Хилюта, кандидаты в мастера спорта, Н. Пугач - I разряд, М. Разуваев - I разряд, Д. Парамонова. Второе место - физико-технический, третье - факультет экономики и управления.

В личном первенстве по доскам победителями стали студенты: 1-я доска - Дмитрий Новиков - матфак, 2-я - Алексей Степаненко - факультет экономики и управления, 3-я доска - Вадим Хилюта - юрфак, 4-я доска - Евгений Сташевский - физико-технический, 5-я доска - Наталья Веремейчик - факультет экономики и управления. По результатам соревнований определена сборная команда университета для участия в соревнованиях среди вузов.

**В.МИХАЙЛОВ, главный судья соревнований, старший преподаватель кафедры физвоспитания.**

# ЭТО ЗАПОМНИТСЯ НАДОЛГО

Н.ВОРОНКО,
студентка 2 курса филологического факультета



**Наталля Варонка, якую вы бачыце на здымку, студэнтка 2 курса філалагічнага факультэта аддзялення рускай мовы і літаратуры. Выдатніца вучобы. А яшчэ Наташа піша вершы, малюе. Такое захапленне дапамагае бачыць жыццё ў светлых колерах, быць аптымісткай. Сёлета Наташа разам з аднакурснікамі была ў экспедыцыі па збору фальклору ў Воранаўскім раёне. Матэрыял, які яна напісала пасля практыкі, дазваляе паўней уявіць побыт і жыццё беларускага народа сто гадоў таму.**

**Прапануем нашым чытачам гэтыя запіскі з практыкі студэнткі Наталлі Варонка.**

Для того, чтобы лучше понять прекрасные произведения устного народного творчества, необходимы глубокие знания народного быта и культуры. Именно по этой причине мы посетили этнографический музей, организованный в средней школе деревни Заболоть. Музей предоставляет прекрасную возможность еще в школе познакомить детей с обстановкой, в которой жили их прадедушки и прабабушки.

Самой интересной частью музея является небольшая деревенская хата, сконструированная в одном из классов. Ее внешнее и внутреннее убранство в мельчайших деталях соответствует эпохе конца XIX -начала XX века. Хата построена из сосновых бревен без фундамента. Поэтому она не отличается прочностью. Из рассказа экскурсовода мы узнали, что примерно через 2-3 года изба начинала проседать. Крыша хаты покрыта соломой. Мы узнали, что существовало два способа укладки соломы: подколос и подстрехарка. Хата состоит из одной большой комнаты, не имеющей перегородок. Центральное место в хате занимает печь, каждая часть которой имеет свое название. Так, можно выделить собственно печь, припек, подприпек и подпечек. В печи готовили пищу, пекли хлебы; в припеке и подприпеке хранили посуду, а подпечек служил жильем для кур. Хорошая хозяйка каждый день выпускала их погулять по хате, а сама подметала этот импровизированный курятник. Интересным является тот факт, что печь всегда располагалась лицевой стороной к окну. Это помогало ей лучше сохранять тепло, даже нетопленной. Печь топили утром, а угли («жар») выгребали в специальную ямку. Если «жар» потухал, это считалось плохой приметой.

Интерьер дома очень простой, но в то же время прочный и удобный. В хате находится стол, сделанный из дубовых досок, вокруг которого располагаются лавки; кровать, люлька, несколько деревянных полок. Переносная лавка называлась «зэдаль», скамейка со стенкой и перилами носила название «канапа». Все предметы мебели изготовлены вручную и украшены геометрической резьбой. Кроме мебели мы имели возможность осмотреть всевозможные предметы быта: глиняные горшки и кувшины, деревянные ведра, ухваты, маслобойку, сундуки для одежды. Почетное место в хате занимала прялка. Именно за ней проводили женщины долгие зимние вечера. В музее имеется и настоящий ткацкий стан. Посетители могут воочию увидеть, как возникали прекрасные произведения народного ткачества.

Огромное впечатление произвело на нас желание белорусов украсить свой быт. В музее мы обнаружили оригинальные образцы «выцінанак» - узоров из бумаги, которые поражали тонкой работой, неистощимой фантазией, изящным рисунком. Кроме «выцінанак» мы имели возможность оценить великолепные образцы вышивки, выполненные на полотенцах, скатертях, платках. Особенно интересны «макотки» - вышитые картины, которые использовались для украшения стен. Они радуют глаз яркими красками, занимательным сюжетом.

В музей почти все экспонаты с любовью доставлены жителями окрестных деревень. Конечно же, есть здесь и образцы белорусской народной одежды. Все они богато украшены вышивкой -геометрическим и растительным орнаментом. Одежда вся самотканая, причем праздничная одежда сшита из тонкого белого льна, а повседневная - из грубого серого холста.

Таким образом, мы могли не только познакомиться с бытом белорусских крестьян столетие назад, но и полюбоваться чудесными произведениями народного искусства, указывающими на высокий уровень материальной культуры. Эта простая белорусская хата словно перенесла нас в ту особую атмосферу, в которой жили наши предки. Именно здесь звучали печальные, лирические песни, веселые сказки, поучительные пословицы и поговорки. Именно здесь создавались фольклорные произведения, которые мы тщательно записываем и собираем. Каждая деталь здесь соответствует исторической действительности. Несмотря на тяжелый труд, нелегкое материальное положение, народ нашел в себе силы создать оригинальные образцы предметов материальной культуры, устного творчества, и не только создать, но и сохранить, и передать последующим поколениям.

Экскурсия была очень интересной, запомнилась нам надолго. И я надеюсь, что музей будет существовать еще очень долго, будет пополняться новыми экспонатами и радовать учеников школы и ее гостей.

# КЛОПАТ АБ ВЕТЭРАНАХ

**М.ВАСІЛЮЧАК,**
**старшыня Савета ветэранаў**

Наш Савет быў абраны тры гады таму. Што зроблена за гэты час? Першае, на што хачу звярнуць увагу - тое, што арганізацыя ветэранаў расце за лік асоб пенсійнага ўзросту, і зараз налічвае больш за 150 чалавек.

На факультэтах і ў аддзелах таксама створаны першасныя ветэранскія арганізацыі. На сённяшні дзень такіх груп адзінаццаць. Яны аказваюць значную дапамогу Савету ветэранаў.

Хачу некалькі слоў сказаць аб нашых ветэранах. Большасць яшчэ працуе, а 55 чалавек ужо знаходзяцца на адпачынку. 25 чалавек -інваліды працы І і ІІ групы. Самыя старэйшыя - С.А. Памеранц 1905 і Ф.В. Гінтаўт 1910 гадоў нараджэння.

З працуючых ветэранаў старэйшыя А.І. Яроцкі, А.І. Смалякоў. Дзевяты дзесятак таксама разменяў А.М. Шышко. 45 гадоў працуе ва універсітэцкай бібліятэцы Б.К. Дзьячкова. Ганарымся імі. А яшчэ ганарымся тым, што ёсць у нашай арганізацыі Герой Савецкага Саюза Іван Данілавіч Лебедзеў.

У сваёй рабоце ветэранская арганізацыя універсітэта кіруецца Статутам Беларускай арганізацыі ветэранаў вайны, працы, узброеных сіл і праваахоўных органаў, які быў зацверджаны ў 1995 годзе. Галоўнай задачай пярвічнай ветэранскай арганізацыі, як запісана ў Статуце, з'яўляецца клопат аб ветэранах, асабліва - аб інвалідах, удзельніках Вялікай Айчыннай вайны, салдацкіх удовах, адзінокіх грамадзянах, садзейнічаць паляпшэнню іх матэрыяльна-бытавых умоў. У гэтым плане робіцца многае. Толькі ў 1998 годзе больш як 200 ветэранаў вайны і працы атрымалі матэрыяльную дапамогу. Стала традыцыяй аказваць матэрыяльную дапамогу ветэранам-жанчынам на 8 сакавіка, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і прыроўненым да іх - на Дзень Перамогі. Восенню выдзяляюцца сродкі на закупку бульбы, садавіны і гароднін. Усе юбіляры таксама атрымліваюць матэрыяльную дапамогу. У 1998 годзе юбілей адзначалі 24 чалавекі.

Можна і яшчэ прыводзіць прыклады клопату аб ветэранах, бо такі клопат стаў нормай нашага жыцця. Хочацца падзякаваць за ўвагу да нашых спраў рэктарат, Савет універсітэта. Асабіста - рэктара С.А. Маскевіча, першага прарэктара І.П. Мартынава, старшыню прафкама Ул. А. Хілюту, члена прафкама Л.І. Мурзіч.

# З ГІСТОРЫІ СТУДЭНЦТВА

**А. БУБНОЎ,**
**студэнт 5 курса факультэта гісторыі і культуры**

17 лістапада студэнты Беларусі адзначалі сваё свята. Мне ж хочацца расказаць Вам, паважаныя чытачы, аб некаторых падзеях з беларускага студэнцкага руху, менавіта аб падзеях міжваеннага часу (1921-1939) на той тэрыторыі Беларусі, якая ўваходзіла ў склад ІІ Рэчы Паспалітай, на так званай «Заходняй Беларусі».

Прадбачу ваша здзіўленне - якія тут маглі быць студэнты, калі нават школ беларускіх было няшмат, беларускія гімназіі існавалі кароткі час (выключаючы Віленскую) і закрываліся, не было дзе рыхтаваць настаўнікаў для беларускіх школ, не тое што для беларускіх вышэйшых навучальных устаноў.

Так, не было тут беларускіх вышэйшых навучальных устаноў, але беларускі студэнцкі рух існаваў, і гэта я паспрабую Вам даказаць.

З часоў Ф. Скарыны, а магчыма, і раней, выбітныя беларускія хлопцы, атрымаўшы дзе-небудзь пачатковую адукацыю і не жадаючыя спыняцца на гэтым, накіроўваліся ў вышэйшыя навучальныя ўстановы іншых земляў. Міжваенны час таксама не выключэнне. Шмат хто з іх паступаў і даволі паспяхова вучыўся. Вялікая колькасць студэнтаў-беларусаў навучалася ў Вільні, Празе, Рыме, Брно, Браціславе, дзе ў пачатку 20-х гадоў ствараліся іх аб'яднанні.

Як вынік перамоў між гэтымі аб'яднаннямі, у 1924 годзе было створана Аб'яднанне Беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА), у якое ўвайшлі арганізацыі Прагі, Вільні, Рыма, Брно і Браціславы, а таксама асобныя студэнты-беларусы з іншых гарадоў (Падэбрады, Варшава і інш.) А ў 1926 годзе АБСА увайшло ў Міжнародную студэнцкую канфедэрацыю (C.I.E.) - гэта значыць, што прадстаўнічая міжнародная арганізацыя прызнала беларускае аб'яднанне - паўнамоцнага прадстаўніка студэнтаў тады яшчэ не існаваўшай дзяржавы Беларусі, нягледзячы на пратэсты нашых гістарычных «сяброў».

Адным уступленнем беларусы не абмежаваліся, яны прынялі ўдзел у VIII і IX міжнародных кангрэсах CIE (у Празе і Рыме), пашыралі сувязі з іншымі аб'яднаннямі. Прыклад - на ІІІ гадавым з'ездзе АБСА, які адбыўся ў Празе і на які прыехалі 20 дэлегатаў ад беларускіх студэнцкіх аб'яднанняў, былі госці ад нямецкай, украінскай, югаслаўскай, грузінскай студэнцкіх арганізацый.

Але наша студэнцтва займалася не толькі дзейнасцю за мяжой. У Заходняй Беларусі дзейнічаў Беларускі студэнцкі саюз (БСС), складзены з навучэнцаў Віленскага універсітэта. У 1933 годзе ў арганізацыю ўваходзілі 65 чалавек, шмат з якіх удзельнічалі ў культурна-асветніцкай арганізацыі Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, які пашыраў сярод беларускага насельніцтва беларускую літаратуру, розныя веды (напрыклад, па гісторыі Беларусі). З дапамогай Беларускай хрысціянскай дэмакратыі студэнты выдавалі штомесячны часопіс «Шлях моладзі», дзе знаходзілі адлюстраванне культурныя і гаспадарчыя абставіны жыцця беларускай інтэлігенцыі і сялянства. Таксама яны праводзілі культурна-асветніцкія акцыі - адна з апошніх - вечар гумару 28 студзеня 1939 года ў Вільні, зразумела, на беларускай мове.

Студэнцтва заняло сваё месца ў беларускім нацыянальным руху міжваеннага перыяду і ўсёй сваёй дзейнасцю дапамагала зняць вызначэнне беларускай нацыі як этнаграфічнага матэрыялу, з якога можна ляпіць каго трэба.

Апынуўшыся за мяжой, беларусы не забыліся сваёй Радзімы і зрабілі ўсё, каб супольнасць прызнала яе.

# Год кота (кролика)



Согласно календарю, принятому в Японии и других странах Востока, в пределах 12-годичного цикла каждый год проходит под знаком какого-нибудь животного. Человек, рожденный в определенном году, приобретает ряд врожденных свойств, в зависимости от которых и складывается его судьба. Популярность этого календаря на Востоке очень велика.

Определенные характеристики получает и весь год того или иного животного. Используя их, восточные мудрецы предрекают, каким может быть год.

Итак, год Кота или Кролика (что одно и то же, разница лишь в том, что японцы и китайцы называют этот год каждый по-своему). Год будет трудным. Возможны природные катаклизмы. Но Кот всегда падает на лапы. Значит, какие бы потрясения ни выпали, все должно закончиться благополучно. Поскольку Кот любит покой, мягкую обстановку, тепло, то и год его предполагает стремление именно к таким состояниям. Кот обычно не выходит из равновесия. Он спокоен и невозмутим. Отдохните, так как следующий год может быть бурным. Год Кота благоприятен для людей закона, юстиции. Ребенок, рожденный в эти годы, будет счастливым и спокойным, если он родился летом.

Те, кто родился в год Кота - 1927, 1939, 1951, 1963, 1975, 1987 - люди сентиментальные, чувствительные, в меру загадочные. Этот год - их. **КОТЫ** будут счастливы в финансовом отношении. Они должны стремиться к комфорту и безопасности, тогда осложнений в жизни не будет.

Что сулит год Кота тем, кто родился в другие годы?

**КРЫСА.** Пусть она будет осторожна. Кот ожидает ее на повороте. Следует ничем не выделяться.

**БЫК.** Это не идеально, но уже лучше. Можно спокойно работать.

**ТИГР.** Пусть воспользуется этим годом для отдыха. Кот ему не повредит.

**ДРАКОН.** Кот не помешает Дракону блистать. Напротив, это его развлечет.

**ЗМЕЯ.** Ура! Она насладится заслуженным отдыхом и подумает о любви. У нее будет успех.

**ЛОШАДЬ.** Хороший год. Любовь, работа, светские обязанности... и, возможно, немного политики.

**КОЗА.** Наконец ею занимаются, ее приглашают, ценят ее компанию! Очень хороший для нее год.

**ОБЕЗЬЯНА.** У нее будут великолепные дела. Этот год со всех сторон хорош.

**ПЕТУХ.** Немного травмированный предыдущим годом, он остается начеку и ничего не предпринимает.

**СОБАКА.** Отдыхает. Она почти счастлива. Кот принесет мир. Она должна этим воспользоваться.

**СВИНЬЯ.** Все было бы хорошо, если бы в воздухе не пахло процессами. Пусть постарается их избежать любой ценой, даже поплатившись...

**(Гороскопы).**

# Астропрогноз на январь

**ОВНЫ.** Напряженное начало месяца и материальные потери обернутся в будущем удачей. Вы улучшите финансовое положение и к концу месяца получите возможность приятного общения с близкими по духу людьми.

**ТЕЛЬЦЫ.** Особенность месяца состоит в том, что проблемы будут надвигаться все вместе. Но решение их дается на удивление легко, чаще всего даже с пользой для вас. Трудными будут дни 14 и 21 января.

**БЛИЗНЕЦЫ.** То, что вы начнете делать в первую неделю января, может затянуться надолго. Весь месяц (и всегда) бережно относитесь к своему здоровью, так как есть риск серьезных заболеваний. Немало проблем и переживаний доставят родственники. Самым тяжелым в эмоциональном плане будет день 4 января.

**РАКИ.** Для вас начинается новая полоса жизни. Фортуна наконец повернется лицом к трудолюбивому и собранному Раку. Успех ждет тех, кто рассчитывает на свои силы, независим, свободен духом. Трудные дни - 4 и 10 января.

**ЛЬВЫ.** Для вас удачными будут первые две недели месяца. Можете рассчитывать на понимание родных и близких в выходные дни. Более напряженной в эмоциональном и деловом плане для многих Львов окажется третья неделя месяца. Звезды советуют не слушать никого и не идти на поводу у обстоятельств.

**ДЕВЫ.** Период сомнений, трудностей и проблем закончился. С каждым днем вы будете чувствовать прилив сил. Придет уверенность в себе, а вместе с ней - положительное решение некоторых вопросов.

**ВЕСЫ.** Вам не следует ждать погоды у моря. Ни взаимопонимание с близкими, ни материальное благополучие не наступят без ваших усилий. Месяц трудный, возможны финансовые просчеты и потери. Но если вы будете более активны - кое-что компенсируется.

**СКОРПИОНЫ.** Велика возможность заболеваний для тех, кто боится простуды. В остальном месяц ровный, без перепадов. Единственное, о чем предостерегают звезды, - не конфликтуйте!

**СТРЕЛЬЦЫ.** Ах, как вы устали! Накопившиеся проблемы, дела, неприятности начнут потихоньку «рассасываться» уже в начале января. Поможет этому расположение небесных светил. И тогда к концу месяца можно будет ожидать приятный сюрприз.

**КОЗЕРОГ.** Вы получите тот энергетический запас, который поможет вам разобраться с ворохом проблем. В целом месяц будет сумбурным, хотя непредвиденные повороты, неприятные хлопоты закончатся внезапно - так же, как и начнутся. Важными будут дни 15 и 21 января.

**ВОДОЛЕЙ.** У вас начинается тот период, когда вы приступите к реализации заветных жизненных планов. Не все сразу, будьте неторопливы, взвешенны. Постарайтесь не портить себе настроение. Ведь у вас все складывается удачно. Будьте осмотрительны 11, 13 и 23 января. В эти дни на вашем небосклоне светила сочетаются не в вашу пользу.

**РЫБЫ.** Будут трудности, особенно - 11 и 18 января. Но они, надо полагать, последние в той черной полосе, что преследует вас уже давненько. Возможны неприятные разговоры, неприятные люди. Обойдите их. Лучшее впереди. И удача, и дело, и партнеры.

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ**
*Фотаілюстрацыя:* **Ул.САРОКІН**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО**

*Здадзена ў набор 17.12.98.*
*Падпісана да друку: 24.12.98. 15.00*
*Заказ № 132*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228.* ☎ 72-08-1[illegible]